АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

УДК 352/353 (476)(091)

ТОКЦЬ СЯРГЕЙ МІХАЙЛАВІЧ

# ДЗЯРЖАЎНЫ АПАРАТ ЦАРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ Ў 30-60-х гг. XIX ст.
## (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус)

07.00.02.01

~~07.00.02~~. - Айчынная гісторыя

А Ў Т А Р Э Ф Е Р А Т
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Мінск - 1997

94(476)

ЛННБ України ім.В.Стефаника
00425941 (P)

Работа выканана ў аддзеле гісторыі Беларусі XIX-пач.XX ст. Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі.

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | доктар гістарычных навук, прафесар Біч М.В. |
| Афіцыйныя апаненты: | доктар гістарычных навук, акадэмік АН Беларусі Ігнаценка І.М. |
| | кандыдат гістарычных навук, дацэнт Сосна У.А. |
| Апаніруючая арганізацыя: | Гомельскі дзяржаўны універсітэт |

Абарона адбудзецца "___" _________ 1997 г. у ___ гадзін на паседжанні Савета Д. 01.40.01. па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара навук пры Інстытуце гісторыі АН Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Ф.Скарыны, 1).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа АН Беларусі: г. Мінск, вул. Сурганава, 15.

Аўтарэферат разасланы "___" _________ 1997 г.

Вучоны сакратар Савета
кандыдат гістарычных навук Грыгор'ева В.В.

Ав. 91,052



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць даследавання. У 1991г. Беларусь стала суверэннай і незалежнай дзяржавай. Дзяржаўнае будаўніцтва ў цэлым і арганізацыя на новых дэмакратычных прынцыпах сістэмы мясцовага кіравання ў прыватнасці, сталі адным з галоўных накірункаў унутрыпалітычнай дзейнасці маладой краіны. Аднак дасягненне поспехаў на гэтых шляху становіцца праблематычным без асэнсавання папярэдняга гістарычнага вопыту, вельмі часта адмоўнага і нярэдка трагічнага, але заўсёды каштоўнага і карыснага для нашчадкаў. Таму адным з важнейшых аспектаў у вывучэнні нашага мінулага стала даследаванне гісторыі мясцовага дзяржаўнага кіравання на беларускіх землях. У поўнай ступені гэта адносіцца і да перыяду знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, нягледзячы на тое, што дзяржаўны апарат тады будаваўся не на аснове мясцовых гістарычных традыцый, а па агульнаімперскаму ўзору і згодна з пастановамі царскай улады. Аднак многія праблемы таго часу - вельмі высокая ступень цэнтралізацыі дзяржаўнай улады, абмежаваныя паўнамоцтвы мясцовага самакіравання, безадказнасць чыноўнікаў перад грамадствам, карумпаванасць сярод дзяржаўных служачых - застаюцца актуальнымі і сёння.

Храналагічныя рамкі работы ахопліваюць 30-60-я гады XIX ст. Выбар ніжняй мяжы даследавання абумоўлены падзеямі паўстання 1830-1831 гг., пасля падаўлення якога царскі ўрад значна актывізаваў сваю палітыку ў Беларусі, накіраваную на поўную ўніфікацыю гэтых губерняў, і ў першую чаргу сістэмы мясцовага кіравання, з уласна расійскімі землямі імперыі. Верхняй мяжой з'яўляецца 1871 г., калі на беларускіх землях было цалкам адменена ваеннае становішча , уведзенае ў пачатку паўстаня 1863 г., і ўсталяваліся структуры і функцыі дзяржаўнага апарату, якія без істотных зменаў дзейнічалі да рэвалюцыі 1905-1907 гг. і пазней. Менавіта ў 30-60-х гг. XIX ст. адбылася значная эвалюцыя структурнай арганізацыі і механізму функцыянавання мясцовых адміністрацыйных установаў, а таксама кадравай палітыкі царскага ўрада, што прывяло да кардынальных зменаў у асабовым складзе чыноўніцкага корпусу.

Распрацаванасць тэмы даследавання. Гістарычнае вывучэнне мясцовых дзяржаўных установаў і царскага чыноўніцтва ў Расійскай імперыі пачынаецца з другой паловы XIX ст. Галоўным накірункам навуковай дзейнасці дарэвалюцыйных даследчыкаў стаў фармаль-

на-юрыдычны аналіз адпаведных артыкулаў імперскага заканадаўства, што тычыліся арганізацыі мясцовай дзяржаўнай улады. У пэўнай ступені гэта быў вымушаны даследчыцкі падыход, бо матэрыялы афіцыйнага справаводства з'яўляліся недаступнымі для навукоўцаў. Тым не менш ужо сучаснікі паставілі такія важныя праблемы вывучэння мясцовага дзяржаўнага кіравання, як праблема дэцэнтралізацыі, узаемадзеяння розных адгалінаванняў адміністрацыйнага апарату, узаемадачыненняў выбарных і бюракратычных устаноў. Тут у першую чаргу неабходна назваць гісторыкаў дзяржаўнай школы А.Д. Градоўскага, М.М.Каркунова, І.Я.Андрыеўскага, а таксама А.І.Лазарэўскага, І.А. Блінова і інш. Аднак усе вышэй названыя даследчыкі разглядалі мясцовы адміністрацыйны апарат толькі на аснове агульнаімперскага матэрыялу і не звярталі ўвагі на асаблівасці арганізацыі дзяржаўнага кіравання ў беларускіх губернях.

Асобныя аспекты структурнай арганізацыі і дзейнасці ўрадавых устаноў царызму ў Беларусі разглядалі ў сваіх работах мясцовыя аўтары - Е.Ф.Арлоўскі, А.І.Мілавідаў, І.А.Нікоцін, Л.Саланевіч. Усе яны належалі да афіцыйна-манархічнага лагеру і імкнуліся апраўдаць палітыку царызму на беларускіх землях. Гістарычныя факты падбіраліся імі з яўнай тэндэнцыйнасцю. Аднак у гэтых работах сустракаецца шмат звестак, якія ўяўляюць значную цікавасць пры даследаванні царскай адміністрацыі ў Беларусі.

У айчыннай гістарыяграфіі розныя аспекты структурнай арганізацыі і дзейнасці дзяржаўнага апарату царызму на беларускіх землях разглядаліся ў працах па сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі. Пачатак вывучэння азначанай праблематыкі паклалі работы Мітрафана Доўнар-Запольскага, Аляксандра Цвікевіча, Усевалада Ігнатоўскага.

На сённяшні дзень да найбольш даследаваных можна аднесці сістэму кіравання дзяржаўнай вёскай, якую разглядалі ў той ці іншай ступені У.А.Сосна, В.А.Загарульская, Я.К.Анішчанка. У іх работах вызначаны асаблівасці структурнай арганізацыі і характару дзейнасці органаў кіравання казёнными сялянамі ў Беларусі. Аднак без асвятлення застаўся аспект аб месцы гэтых устаноў у агульнай сістэме мясцовага дзяржаўнага кіравання, складзе чыноўніцкага корпусу. Структура і функцыі органаў кіравання сялянамі пасля рэформы 1861 г. разглядаліся ў манаграфіях В.П.Панюціча і М.Б.Фрыдман. У гэтых работах, на нашу думку, недастаткова даследаваны ўплыў палітычнай сітуацыі ў тагачаснай Беларусі на характар дзейнасці аз-

начаных установ і іх асабовы склад.

Асаблівасці арганізацыі судовай сістэмы Расійскай імперыі на беларускіх землях даследавалі Ф.Р.Бялевіч, А.У.Марыскін, А.Ф.Свіб. Гэтыя навукоўцы таксама не разглядалі асобна праблему чыноўніцкага складу судовых установ.

Дзейнасць царскай адміністрацыі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. атрымала грунтоўнае асвятленне ў манаграфіі С.М.Самбук. Аўтар на аснове багатага архіўнага матэрыялу паказала сутнасць імперскай палітыкі самадзяржаўя, яе галоўныя накірункі і метады правядзення ў жыццё. У рабоце разглядаецца таксама кадравая палітыка цаскага ўрада адносна прызначэння чыноўнікаў на беларускіх землях. Аднак аналізу складу служачых мясцовага адміністрацыйнага апарату ў манаграфіі не праводзіцца.

У савецкай і сучаснай расійскай гістарыяграфіі розныя аспекты гісторыі мясцовага дзяржаўнага кіравання ў часы Расійскай імперыі даследавалі М.П.Ярошкін, І.В.Аржахоўскі, П.М.Зыранаў, М.М.Шумілаў. У работах гэтых аўтараў атрымалі асвятленне такія пытанні, як структура і механізм функцыянавання адміністрацыйнага апарату, яго сацыяльная база і склад чыноўніцкага корпусу. Усе вышэйназваныя расійскія гісторыкі разглядалі мясцовы дзяржаўны апарат царызму пераважна на матэрыялах унутраных губерняў імперыі і фактычна не звярталі ўвагі на спецыфіку арганізацыі дзяржаўнага кіравання на беларускіх землях.

У польскай гістарыяграфіі структуру і функцыі мясцовых дзяржаўных установ Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі даследавалі, пераважна на грунце вывучэння заканадаўчых матэрыялаў, С.Кутшэба, Б.Леснадорскі, В.Бартэль, К.Гжыбароўскі. Работы названых аўтараў знаходзяцца фактычна на сумежжы гісторыі і правазнаўства, у іх амаль не выкарыстоўваліся архіўныя матэрыялы аб дзейнасці царскай адміністрацыі. Вялікая ўвага ў азначаных даследаваннях надавалася разгляду асаблівасцей арганізацыі мясцовага кіравання царызму на беларускіх землях.

Гісторыя мясцовых дзяржаўных установ Расійскай імперыі заўсёды выклікала значную цікавасць заходніх, у першую чаргу амерыканскіх, гісторыкаў. У сінтэзнай рабоце Р.Пайпса "Расія пры старым рэжыме", якая ахоплівае храналагічны адрэзак з X ст. да 80-х гг. XIX ст, шмат месца адводзіцца аналізу эвалюцыі дзяржаўнага апарату царскай імперыі ў бок узмацнення бюракратычна-паліцэйскага элементу. Р.Робінс даследаваў механізм узаемаадносінаў мясцо-

ЛНБ ім.В.СТЕФАНИКА
НАН УКРАЇНИ

вай адміністрацыі з цэнтральнай уладай. Работы гэтых навукоўцаў былі выкананы на агульнаімперскім матэрыяле.

Аналіз гістарыяграфіі праблемы мясцовага дзяржаўнага кіравання царызму ў Беларусі дазваляе, на нашу думку, зрабіць выснову аб неабходнасці правядзення спецыяльнага комплекснага даследавання структурнай арганізацыі і чыноўніцкага складу адміністрацыйнага апарату царызму ў беларускіх губернях у 30-60-х гг. XIX ст.

Крыніцы, пакладзеныя ў аснову дадзенага даследавання , можна падзяліць на наступныя групы: 1) матэрыялы афіцыйнага справаводства, 2) даведачна-статыстычныя матэрыялы, 3) успаміны і запіскі сучаснікаў. Найбольшай па аб'ёму і важнейшай па значнасці з'яўляецца першая група - афіцыйна-дакументальныя матэрыялы, якую ў сваю чаргу можна разбіць на асобныя падгрупы. Да адной з іх належаць заканадаўчыя матэрыялы, у якіх вызначаліся структурная арганізацыя, функцыі, механізм узаемадзеяння і парадак справаводства мясцовых дзяржаўных устаноў, а таксама правілы прызначэння на службу чыноўнікаў, умовы атрымання новых чыноў і г.д. Гэтыя матэрыялы знаходзяцца ў кнігах Збору законаў Расійскай імперыі за розныя гады і ва ўсіх трох Поўных зборах законаў. Да другой падгрупы належаць матэрыялы справаводства мясцовых дзяржаўных устаноў, якія захоўваюцца ў Нацыянальных гістарычных архівах Беларусі ў Гродне і ў Мінску. Найбольш важная для даследавання бюракратычнага апарату інфармацыя канцэнтруецца ў фондах губернатарскіх канцылярый, праз якія праходзілі ўсе самыя істотныя з пункту гледжання губернскага кіраўніцтва звесткі аб мясцовым палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці. У дадзеным дысертацыйным праекце пераважна выкарыстаны архіўныя матэрыялы адміністрацыйнага справаводства Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, у значна меншай ступені - Магілёўскай і зусім не выкарыстоўваліся такія матэрыялы па Віленскай губерні. Аднак, неабходна адзначыць, што ўмовы функцыянавання дзяржаўнага апарату ў Віленскай губерні былі фактычна аналагічнымі Гродзенскай губерні, а Магілёўскай - Віцебскай. Для вывучэння асабовага складу дзяржаўнага апарату вельмі важную падгрупу афіцыйна-дакументальных матэрыялаў складаюць фармулярныя паслужныя спіскі чыноўнікаў. У іх фіксаваліся галоўныя звесткі: імя і прозвішча, узрост, веравызнанне, саслоўнае паходжанне, адукацыя, маёмасны стан і праходжанне службы. Свядомае скажэнне гэтага віду крыніц амаль поўнасцю выключана. На жаль, яны захаваліся толькі часткова. Найбольш поўныя калекцыі фармy-

лярных спіскаў зберагліся адносна чыноўніцтва Мінскай і Гродзенскай губерняў. Намі даследавана прыблізна каля 2 тысяч паслужных спіскаў чыноўнікаў азначаных губерняў за 1830г., канец 50-х гг. і канец 60-х гг. XIX ст, што складае прыкладна каля палавіны спіскаў усіх чыноўнікаў дзяржаўных устаноў за названыя гады. Усе гэтыя спіскі прааналізаваны ў адпаведнасці з выбранымі параметрамі. Вынікі аналізу, на нашу думку, у цэлым верна адлюстроўваюць структуру царскага чыноўніцтва ў Беларусі адносна веравызнання, сацыяльнага паходжання, маёмаснага стану, узроўню адукацыі. Другую асноўную групу крыніц складаюць даведачна-статыстычныя матэрыялы. З 50-х гг. XIX ст. пачынаецца выданне губернскіх памятных кніжак і адрас-календароў, у якіх змяшчаліся статыстычныя звесткі аб складзе мясцовага чыноўніцтва. На пачатку 60-х гг. XIX ст. афіцэрамі Генеральнага штаба былі сабраны і выдадзены зборнікі статыстычных матэрыялаў па Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях, дзе меліся дадзеныя аб структурнай арганізацыі і фінансаванні мясцовага дзяржаўнага апарату, колькасці і грашовым забеспячэнні чыноўнікаў. Успаміны і запіскі сучаснікаў складаюць трэцюю групу крыніц. Галоўная іх перавага заключаецца ў тым, што яны дазваляюць убачыць аспект дзяржаўнай службы, які звычайна застаецца па-за межамі афіцыйнага справаводства. Нягледзячы на афіцыйна-манархічную пазіцыю большасці аўтараў, у мемуарах і запісках сучаснікаў утрымліваецца шмат звестак, якія ўяўляюць значную цікавасць для асвятлення гісторыі дзяржаўнага апарату царызму ў Беларусі.

<u>Мэта і задачы даследавання</u>. Мэтай дадзенага дысертацыйнага даследавання з'яўляецца навуковае асвятленне структурнай арганізацыі і чыноўніцкага складу мясцовага дзяржаўнага апарату царызму ў Беларусі ў 30-60-х гг. XIX ст. на грунце аналізу матэрыялаў афіцыйнага справаводства царскай адміністрацыі. Для дасягнення пастаўленай мэты вырашаюцца наступныя задачы:

- вызначыць асаблівасці структурнай арганізацыі і механізму функцыянавання сістэмы мясцовага дзяржаўнага кіравання царскай імперыі ў Беларусі;
- вызначыць ступень удзелу розных саслоўных груп і мясцовага грамадства ў цэлым у арганізацыі і дзейнасці мясцовага кіравання;
- вызначыць накірунак эвалюцыі мясцовага дзяржаўнага апарату ў Беларусі ў працэсе яго развіцця і рэфармавання;
- прааналізаваць склад губернскага і павятовага чыноўніцтва

адносна яго саслоўнага паходжання, канфесійнай прыналежнасці, маёмаснага становішча і ўзроўню адукацыі;

- разгледзець кадравую палітыку царскага ўрада адносна прызначэння адказных асобаў на мясцовыя адміністрацыйныя пасады.

Метады даследавання. Пры выкананні работы аўтар выкарыстоўваў метад структурнага аналізу, гісторыка-параўнаўчы і статыстычны метады. У аснову даследавання складу чыноўніцкага корпусу быў пакладзены метад матэматычнай апрацоўкі такога віду масавых архіўных крыніц, як фармулярныя паслужныя спіскі і адрас-календары.

## Навуковая навізна даследавання

1. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі даецца разгорнутая характарыстыка мясцовага дзяржаўнага апарату Расійскай імперыі ў Беларусі ў разглядаемы храналагічны перыяд адносна яго структурнай арганізацыі і механізму функцыянавання.

2. Вызначаны адрозненні ў сістэме мясцовага дзяржаўнага кіравання ў беларускіх губернях ад цэнтральных губерняў імперыі, якія былі абумоўлены гістарычнай спадчынай - арганізацыя судовых устаноў і органаў дваранскага саслоўнага самакіравання ў адпаведнасці з артыкуламі Статута ВКЛ, і палітычнай сітуацыяй (паўстанні 1831 і 1863 гадоў) - абмежаванне выбарнага прынцыпу ў механізме замяшчэння службовых пасадаў, утварэнне пасадаў ваенных начальнікаў і жандарскіх камандаў.

3. Прасочваецца і вызначаецца характар і накірунак эвалюцыі сістэмы мясцовага дзяржаўнага кіравання ў Беларусі ў разглядаемы перыяд ад саслоўна-бюракратычнай да паліцэйска-бюракратычнай мадэлі.

4. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі даследаваны структурная арганізацыя, механізм функцыянавання і асабовы склад выбарных саслоўных устаноў, а таксама характар іх узаемадзеяння з урадавымі бюракратычнымі ўстановамі.

5. Праведзены навуковы аналіз і атрыманы дадзеныя па складу царскага чыноўніцтва ў Беларусі адносна яго саслоўнай і канфесійнай структуры, маёмаснага становішча, узроўню адукацыі і геаграфічнага паходжання.

6. Прааналізавана кадравая палітыка царскага ўрада адносна прызначэння чыноўнікаў на адказныя службовыя пасады.

Практычная і эканамічная значнасць атрыманых вынікаў. Пра-

ведзенае даследаванне і атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны ў наступных работах па гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Структурны аналіз сістэмы мясцовага кіравання з'яўляецца падмуркам для больш паглыбленага вывучэння асобных устаноў і органаў дзяржаўнага апарату і палітыкі царскага самадзяржаўя на беларускіх землях. Атрыманыя дадзеныя адносна асабовага складу чыноўніцкага корпусу з поспехам могуць быць выкарыстаны ў даследаваннях сацыяльнай і канфесійнай структуры насельніцтва, характару землеўладання, сістэмы адукацыі і г.д.

Палажэнні да абароны

1. Пасля паўстання 1830-31гадоў царскі ўрад прыступіў да рашучага правядзення палітыкі уніфікацыі сістэмы мясцовага кіравання і суду ў беларускіх губернях з агульнаімперскай шляхам ліквідацыі тых асаблівасцей, якія захаваліся ў Беларусі з часоў Рэчы Паспалітай - судаводства ў адпаведнасці з артыкуламі Статута ВКЛ, гістарычныя назвы ўстаноў і службовых асобаў, ужыванне польскай мовы ў справаводстве. Рэалізацыя гэтай палітыкі суправаджалася ўзмацненнем бюракратычнага элементу ў мясцовым дзяржаўным апараце ў супрацьвагу выбарным прадстаўнікам мясцовага дваранства.

2. У 30-х гадах XIX ст. царскі ўрад ліквідаваў асаблівасці ў арганізацыі дваранскага саслоўнага самакіравання ў Беларусі, адначасова значна звузіўшы кола асобаў, якія маглі прымаць удзел у выбарах. Была уніфікавана з агульнаімперскай і сістэма гарадскога самакіравання шляхам ліквідацыі кагалаў і ўключэння прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва ў агульныя гарадскія ўстановы, праўда з пэўнымі абмежаваннямі. У 30-е гады пачынаецца і ўтварэнне ўстаноў саслоўнага самакіравання сярод дзяржаўных сялян, што, нягледзячы на вельмі моцна ўсечаныя іх правы і паўнамоцтвы, было станоўчай з'явай ў развіцці мясцовага самакіравання на беларускіх землях.

3. Спроба прыцягнення ў Беларусь пасля паўстання 1830-31 гадоў чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі , якія павінны былі стаць тут надзейнай апорай царскай улады, не прынесла поспеху, бо ўрад не здолеў стварыць ім дастатковых матэрыяльных умоў. Сярэдняе і ніжэйшае чыноўніцтва беларускіх губерняў фармавалася ў 30-50-я гады амаль выключна з мясцовых ураджэнцаў, пераважна дробнай шляхты каталіцкага веравызнання.

4. У 60-х гадах XIX ст. царызм устанавіў ў Беларусі рэжым

надзвычайных законаў і сістэму ваенна-паліцэйскага кіравання. Мясцовая дзяржаўная адміністрацыя атрымала пашыраныя ўладныя паўнамоцтвы. На яе была ўскладзена задача правядзення поўнай і канчатковай уніфікацыі Беларусі з цэнтральнымі губернямі імперыі. Гэтую сістэму мясцовага дзяржаўнага кіравання можна ахарактарызаваць як паліцэйска-бюракратычную.

5. Пасля паўстання 1863 г. царскі ўрад фактычна спыніў на беларускіх землях дзейнасць дваранскага самакіравання. Дваранскіх маршалкаў і дэпутатаў сталі прызначаць мясцовыя ўлады як звычайных дзяржаўных служачых. Пад поўны кантроль дзяржаўнай адміністрацыі былі пастаўлены і ўтвораныя ў 1861 г. органы валаснога сялянскага самакіравання. Выбары адказных асобаў гэтых устаноў залежалі ў значнай ступені ад канфесійнай прыналежнасці кандыдатаў.

6. Пасля 1863 г. царскі ўрад праводзіць палітыку замены чыноўнікаў мясцовага паходжання каталіцкага веравызнання на выхадцаў з унутраных губерняў, якім было прызначана дадатковае грашовае ўтрыманне і нададзены ільготы ў набыцці зямельных валоданняў. У канцы 60-х гадоў XIX ст. амаль усе пасады, абавязкам якіх была непасрэдная праца з насельніцтвам - паліцэйскіх спраўнікаў і прыставаў, міравых пасрэднікаў, судовых следчых, займалі ўраджэнцы цэнтральных губерняў імперыі. Менавіта гэтыя чыноўнікі сталі галоўнай апорай царскага ўрада ў правядзенні яго палітыкі не беларускіх землях.

<u>Апрабацыя работы</u>. Асноўныя вынікі работы знайшлі адлюстраванне ў выступленнях аўтара на наступных навуковых канферэнцыях: "Культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XII-пач. XX ст.", Гродна, 1991; "Царква і культура народаў ВКЛ і Беларусі XII-пач.XX ст.", Гродна, 1992; "Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей", Ваўкавыск, 1996; Дзісненскія чытанні, Мёры, 1996; "Гістарычная памяць народаў ВКЛ і Беларусі XIII-XIX стст.", Гродна, 1996; Другая Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў, Мінск, 1997.

Вынікі дысертацыі былі апублікаваны ў 7 навуковых артыкулах агульным памерам 4 д.а.

<u>Структура даследавання</u>. Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў і высноваў. Прыкладаецца спіс выкарыстанай літаратуры і крыніц, а таксама дадатак з 14 статыстычных табліц.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва Уводзінах даецца ацэнка сучаснага стану вывучэння разглядаемай праблемы і зыходных дадзеных для больш паглыбленага яе даследавання.

У першым раздзеле "Структура і функцыі мясцовага дзяржаўнага апарату царызму ў Беларусі ў 30-50-х гадах XIX ст." аўтар даследуе структурную арганізацыю і механізм функцыянавання дзяржаўных установ Расійскай імперыі ў Беларусі. Асаблівая ўвага звяртаецца на адрозненні ад цэнтральных, уласна расійскіх губерняў, якія былі абумоўлены гістарычнай спадчынай і палітычнымі абставінамі, хаця царскае самадзяржаўе і імкнулася да поўнай уніфікацыі сістэмы мясцовага кіравання на беларускіх землях з агульнаімперскай. У П. 1.1. разглядаецца мясцовы апарат Міністэрства ўнутраных спраў, які быў самым буйным па колькасці ўстаноў і чыноўнікаў. Галоўную ролю ў механізме яго функцыянавання, як і ўсёй мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі ў цэлым, адыгрывалі губернатары. Закон афіцыйна называў іх "гаспадарамі губерняў". Правы і абавязкі губернатараў закраналі фактычна ўсе сферы мясцовага жыцця, але галоўным у іх дзейнасці было захаванне палітычнага спакою і падпарадкавання імперскай уладзе. У Беларусі адной з важнейшых задач губернатараў стала праводзенне палітыкі русіфікацыі тутэйшага насельніцтва. Прычым яны самым непасрэдным чынам уплывалі на фарміраванне формаў і метадаў гэтай палітыкі, дасылаючы ў Пецярбург адпаведныя праекты і прапановы, а таксама выказваючы свае меркаванні ў гадавых справаздачах імператару. Істотным момантам у арганізацыі мясцовага кіравання на беларускіх землях была наяўнасць тут інстытута генерал-губернатараў, якія мелі пашыраныя ўладныя паўнамоцтвы. Начальнікі губерняў дзейнічалі пад іх непасрэдным кантролем. Утварэнне гэтых пасадаў тлумачылася складанай палітычнай сітуацыяй і неабходнасцю ўмацавання мясцовай дзяржаўнай улады. У разглядаемы перыяд беларускія этнічныя землі ўваходзілі ў склад двух генерал-губернатарстваў з цэнтрамі ў Вільні і Віцебску. Губернатары ўзначальвалі губернскія праўленні, якія былі самымі вялікімі па штату установамі МУС, а таксама цэлы шэраг іншых губернскіх устаноў, камітэтаў і камісій гэтага ведамства - прыказы грамадскай апекі, камітэты аховы здароўя, камісіі народнага харчавання, камітэты па земскіх павіннасцях, статыстычныя і г.д. Азначаныя

ўстановы ажыццяўлялі разнастайныя гаспадарчыя, папячыцельныя і кантрольныя функцыі мясцовага кіравання. Аднак самую важную ролю ў сістэме мясцовых органаў МУС адыгрывалі паліцэйскія ўстановы, якія падзяляліся на гарадскія і земскія. Правы і абавязкі іх кіраўнікоў, гараднічых і земскіх спраўнікаў, былі своеасаблівай праекцыяй правоў і абавязкаў губернатараў на гарадскім і павятовым узроўнях. Згодна з імперскім заканадаўствам земскія спраўнікі і павятовыя паліцэйскія засядальнікі ў разглядаемы перыяд выбіраліся памесным дваранствам. Аднак пасля паўстання 1831г. урад пазбавіў гэтага права дваран Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, а ў 1854 г.- у сувязі з Крымскай вайной - таксама дваранства Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Азначаных паліцэйскіх чыноўнікаў сталі прызначаць губернатары, што прывяло да ўзмацнення бюракратычнага элементу ў сістэме мясцовага кіравання ў Беларусі.

У П. 1.2. разглядаюцца структура і функцыі фінансава-гаспадарчых і судовых установ дзяржаўнага апарату. Мясцовымі органамі Міністэрства фінансаў у Расійскай імперыі былі губернскія казённыя палаты і падпарадкаваныя ім павятовыя казначэйствы. Галоўным іх абавязкам з'яўлялася забеспячэнне збору ў імперскую скарбонку шматлікіх дзяржаўных падаткаў. У гэтай сферы дзейнасці азначаныя ўстановы захоўвалі некаторую самастойнасць ад начальнікаў губерняў. На казённыя палаты ў беларускіх губернях быў ускладзены таксама кантроль за гаспадарчым кіраваннем дзяржаўных маёнткаў, якія тут звычайна аддаваліся ў арэнду мясцоваму дваранству. У 1839 г. гэтая функцыя перайшла да мясцовых установ новаўтворанага Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. На губернскія палаты дзяржаўных маёмасцей і падпарадкаваныя ім акруговыя ўпраўленні было ўскладзена кіраўніцтва заснаванымі ў гэты час у беларускіх губернях органамі самакіравання дзяржаўных сялян - сельскімі грамадамі.

Даволі істотныя адрозненні ад унутраных губерняў імперыі існавалі ў сістэме мясцовых судовых установ Беларусі. Большасць гэтых асаблівасцей - гістарычныя назвы ўстаноў і пасадаў, парадак справаводства ў адпаведнасці з нормамі Статута ВКЛ і г.д. - захавалася яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай. Аднак пасля паўстання 1831 г. царскі ўрад прыступіў да ліквідацыі азначаных асаблівасцей і уніфікацыі мясцовай судовай сістэмы з агульнаімперскай.

У П. 1.3. разглядаюцца структура, функцыі і парадак дзейнасці выбарных саслоўных установ. Галўнае месца сярод іх займалі органы дваранскага самакіравання, найперш - губернскія і павятовыя мар-

шалкі. Пасля паўстання 1831 г. урад прадпрымае шэраг крокаў, накіраваных на абмежаванне самастойнасці дваранскіх устаноў. Указам 1835 г. у выбарах дазвалялася ўдзельнічаць толькі тым дваранам, якія не менш 10 гадоў былі на царскай службе, што рэзка звузіла кола выбаршчыкаў. Гэтае абмежаванне распаўсюджвалася на Віленскую, Гродзенскую і Мінскую губерні. Аднак дваранскія установы па-ранейшаму адыгрывалі вельмі істотную ролю ў сістэме мясцовага кіравання.

Органы гарадскога самакіравання - гарадскія думы, магістраты і ратушы - дзейнічалі пад пільным наглядам з боку дзяржаўнай адміністрацыі, найперш - гарадской паліцыі. У разглядаемы перыяд урад ажыццяўляе палітыку уніфікацыі сістэмы органаў гарадскога самакіравання беларускіх губерняў з агульнаімперскай. У 1844 г. былі ліквідаваны яўрэйскія кагалы, а прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва ўключаны, праўда з пэўнымі абмежаваннямі, у склад агульных гарадскіх устаноў. Поўная залежнасць ад дзяржаўнай бюракратыі і абмежаваная самастойнасць органаў гарадскога самакіравання спараджалі абыякавасць гараджан да выбарнай службы і рабілі дзейнасць гарадскіх устаноў малаэфектыўнай.

У 30-х гадах XIX ст. пачынаецца ўтварэнне органаў саслоўнага самакіравання сярод дзяржаўных сялян Беларусі. З 1839 г. дзяржаўны кантроль за іх дзейнасцю ажыццяўлялі мясцовыя органы Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Нягледзячы на вельмі абмежаваную самастойнасць сялянскіх устаноў іх утварэнне стала прагрэсіўнай з'явай у развіцці сістэмы мясцовага кіравання ў Беларусі.

На працягу 30-50-х гадоў XIX ст. назіраецца працэс паступовага разрастання мясцовага дзяржаўнага апарату і ўскладнення яго функцый. Ва ўмовах Беларусі, дзе ўрад не давяраў мясцоваму дваранству і гарадскім саслоўям, было асабліва значным узмацненне бюракратычнага элементу ў сістэме губернскага кіравання з аднačасовым прыніжэннем ролі выбарных пасадаў і устаноў.

У раздзеле другім <u>"Змены ў структурнай арганізацыі і накірунках дзейнасці мясцовага дзяржаўнага апарату царызму ў Беларусі ў 60-х гадах XIX ст."</u> даследуюцца пераўтварэнні, якія адбыліся ў сістэме мясцовага кіравання на беларускіх землях на працягу 60-х гадоў XIX ст. У П. 2.1. другога раздзелу разглядаюцца змены, якія адбыліся ў выніку ўвядзення ваеннага становішча і сістэмы ваенна-паліцэйскага кіравання ў сувязі з паўстаннем 1863 г. Істотную ролю ў гэтых падзеях адыгрываў віленскі генерал-губернатар Міхаіл

Мураўёў, прызначаны на сваю пасаду ў маі 1863 г. з надзвычайнымі ўладнымі паўнамоцтвамі. Яму былі падпарадкаваны 6 беларуска-літоўскіх губерняў з правам змяшчаць і прызначаць сваёй уладай нават губернатараў. Ва ўсе паветы, а пазней нават і паліцэйскія станы, па загаду начальніка краю прызначаліся ваенныя начальнікі, якім у палітычных адносінах падпарадкоўвалася ўся мясцовая дзяржаўная адміністрацыя. Звыш таго, у лістападзе 1863 г. ва ўсіх паветах беларускіх і літоўскіх губерняў утвараліся асобныя жандарскія каманды, якія падпарадкоўваліся генерал-губернатару і на месцах - ваенным начальнікам. Спецыяльнымі пастановамі забараняліся выкарыстанне польскай мовы ў грамадскім жыцці і некаторыя абрады каталіцкай царквы. Кантроль за іх выкананнем ускладаўся на ваенных начальнікаў, жандараў і паліцыю. Праблема беларускай мовы і нацыянальнай самабытнасці беларусаў фактычна ігнаравалася царскімі ўладамі. Вялізныя сілы і сродкі былі кінуты на правядзенне палітыкі "обрусения" мясцовага насельніцтва, у першую чаргу праз народную школу і праваслаўную царкву. Канчатковай мэтай гэтай палітыкі урад бачыў такое становішча спраў, калі б беларусы нічым не адрозніваліся ад сваіх усходніх суседзяў у нацыянальна-культурных адносінах. Абавязкам мясцовай адміністрацыі, найперш жандараў і паліцыі, стаў пільны кантроль за дакладным ажыццяўленнем азначанай палітыкі. Так жа, як за выкананнем закону, згодна з якім асобам каталіцкага веравызнання, акрамя сялян, было забаронена набываць ва ўласнасць тут зямлю. Усё гэта ў сукупнасці надзвычай пашырала ўладныя паўнамоцтвы мясцовай адміністрацыі, стварала спрыяльныя ўмовы для самаўпраўства чыноўніцтва. Хаця ваеннае становішча на беларускіх землях было адменена да 1871 г., а пасады ваенных начальнікаў скасаваныя яшчэ раней, многія абмежавальныя законы і пастановы працягвалі дзейнічаць да пачатку XX ст., стаўшы адным з вызначальных фактараў грамадска-палітычнага і культурнага жыцця.

На працягу 60-х гадоў XIX ст. у Расійскай імперыі быў праведзены цэлы шэраг пераўтварэнняў у сістэме мясцовага дзяржаўнага кіравання з мэтай прыстасавання бюракратычнага апарату да новых сацыяльна-эканамічных і культурных умоў. Рэалізацыя гэтых адміністрацыйных рэформаў на беларускіх землях асвятляецца ў П. 2.2. У 1862 г. урад правёў акцызную рэформу, якая мела мэтай рэарганізацыю сістэмы збору дзяржаўнага падатку на выраб і продаж алкагольных напояў. Аддача піцейных збораў на водкуп прыватным асобам

была заменена непасрэдным спагнаннем азначанага падатку з вытворцаў і прадаўцоў "віна" спецыяльна ўтворанымі дзяржаўнымі установамі - губернскімі акцызнымі ўпраўленнямі і наглядчыкамі. Правядзенне рэформы абумовіла тое, што даход ад піцейных збораў складаў палову ўсіх дзяржаўных прыбыткаў. У 1865 г. царскі ўрад рэарганізаваў унутраную структуру і парадак справаводства губернскіх праўленняў, у 1866 г. - казённых палатаў і палатаў дзяржаўных маёмасцей. У тым жа 1866 г. былі ўтвораны новыя губернскія ўстановы - кантрольныя палаты, абавязкам якіх з'яўлялася рэвізія фінансавай дзейнасці ўсіх дзяржаўных устаноў. Названыя пераўтварэнні не змянялі істотна характару дзейнасці мясцовага бюракратычнага апарату. Куды больш радыкальны характар мела судовая рэформа ў Расійскай імперыі. Аднак правядзенне яе ў Беларусі было адкладзена з палітычных меркаванняў. Праўда, магчымасць увядзення новых судовых устаноў з ініцыятывы ўрада абмяркоўвалася кіраўніцтвам беларускіх губерняў, якое выказалася за іх утварэнне, але з такімі абмежаваннямі, каб гэтыя установы паставіць у поўную залежнасць ад губернскіх уладаў.

У П. 2.3. разглядаюцца змены ў сістэме органаў саслоўнага самакіравання. Пасля паўстання 1863 г. царскі ўрад адмяніў правядзенне дваранскіх выбараў у беларускіх губернях і тым самым была спынена дзейнасць тут шляхецкага самакіравання. Маршалкі і іншыя адказныя асобы, якія раней выбіраліся дваранствам, з гэтага часу сталі прызначацца губернскімі ўладамі і фактычна ператварыліся ў звычайных дзяржаўных чыноўнікаў. Гэтыя дзеянні ўрада былі выкліканы як удзелам у паўстанні часткі памеснага дваранства, так і дамінаваннем апазіцыйных да царызму настрояў у асяроддзі дваранскага саслоўя Беларусі ў цэлым. Гарадскія саслоўныя ўстановы па-ранейшаму існавалі ў бядотным стане. На пачатку 60-х гадоў XIX ст. урад ініцыяваў абмеркаванне губернскімі ўладамі шляхоў рэфармавання гарадскога самакіравання. Але падзеі 1863 г. адсунулі гэтую праблему на другі план. У выніку правядзення рэформы 1861г. былі ўтвораны сельскія і валасныя органы сялянскага самакіравання і спецыяльныя ўстановы, якія ажыццяўлялі кантроль за іх дзейнасцю. Асноўным элементам гэтай сістэмы сталі міравыя пасрэднікі. Яны зацвярджаліся на свае пасады Сенатам з ліку мясцовых памешчыкаў і толькі Сенат мог вызваляць іх ад пасадаў у адпаведнасці з судовай пастановай. Дэпутаты памеснага дваранства складалі большасць і ў губернскіх установах па сялянскіх справах. У час паўс-

тання 1863 г. абвастрыліся супярэчнасці паміж міравымі пасрэднікамі, большасць з якіх належала да мясцовых памешчыкаў каталіцкага веравызнання, апазіцыйных да ўрадавай палітыкі, і дзяржаўнай адміністрацыяй. У выніку віленскі генерал-губернатар, згодна са спецыяльным царскім указам атрымаў права адлучаць ад пасадаў міравых пасрэднікаў і прызначаць на іх месцы чыноўнікаў па свайму выбару. Апошніх запрашалі пераважна з унутраных губерняў імперыі. Важнейшай задачай у дзейнасці новага складу служачых міравых установ стала не проста рэалізацыя палажэнняў рэформы 1861 г., а правядзенне палітыкі "обрусения" беларускага сялянства шляхам "узвышэння асноў праваслаўя і рускай народнасці". Пад пільным наглядам дзяржаўнай адміністрацыі адбываліся выбары адказных асобаў сялянскага самакіравання - валасных старшыняў і сельскіх старастаў. Асаблівую ўвагу ўлады надавалі пасадам валасных пісараў, на якія звычайна прызначаліся адстаўныя унтэр-афіцэры і недавучкі-семінарысты, пераважна ўраджэнцы цэнтральных губерняў. Нягледзячы на моцна абмежаваную самастойнасць сялянскіх выбарных установ, іх ўтварэнне з'яўлялася, безумоўна, прагрэсіўным крокам у развіцці мясцовага самакіравання ў Беларусі.

Трэці раздзел "Чыноўніцкі склад дзяржаўнага апарату царызму ў Беларусі ў 30-60-х гадах XIX ст." прысвечаны аналізу складу чыноўніцкага корпусу адносна веравызнання, саслоўнага паходжання, узроўню адукацыі, маёмаснага стану, геаграфічнага паходжання, а таксама кадравай палітыкі царскага урада. У П. 3.1. даецца характарыстыка імперскага чыноўніцтва як асобай сацыяльнай групы, разглядаюцца ўмовы паступлення на дзяржаўную службу і яе праходжання, асаблівасці складу царскага чыноўніцтва ў Беларусі напярэдадні паўстання 1831 г. У адпаведнасці з законамі Расійскай імперыі права паступлення на грамадзянскую дзяржаўную службу мелі прадстаўнікі ўсіх саслоўяў, акрамя прыгонных сялян. Аднак з 1827 г. гэтага права былі пазбаўлены выхадцы з падатных станаў, акрамя тых, хто здолеў атрымаць вышэйшую адукацыю. Хуткасць прасоўвання ўверх па службовай лесвіцы залежала вельмі істотна ад саслоўнага паходжання і ўзроўню адукацыі. Аналіз фармулярных спіскаў штатных чыноўнікаў Гродзенскай і Мінскай губерняў сведчыць аб тым, што абсалютная большасць іх паходзіла з дробнай шляхты. Толькі сярод чыноўнікаў, якія служылі па выбару дваранства, амаль усе былі памешчыкамі. Абсалютная большасць служачых належала да мясцовых ураджэнцаў і увесь час служыла ва ўстановах сваёй губерні. Дадзе-

ный аб веравызнанні ў той час яшчэ не фіксаваліся ў фармулярных спісках, як не фіксаваліся і дадзеныя аб заканчэнні царкоўных і прыватных навучальных устаноў, што не дазваляе аб'ектыўна вызначыць узровень адукаванасці дзяржаўных служачых.

У П. 3.2. даследуецца чыноўніцкі склад мясцовых дзяржаўных устаноў у 30-50-х гг. XIX ст. і кадравая палітыка царскага ўрада ў гэты перыяд. Пасля паўстання 1831 г. урад імкнуўся праводзіць палітыку прыцягнення ў Беларусь чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі, надаўшы ім шэраг ільготаў. Гэтыя чыноўнікі павінны былі стаць надзейнай апорай царскай улады на беларускіх землях. Аднак азначаная палітыка не прынесла істотных вынікаў, бо ўрад не здолеў забяспечыць прыезджым служачым задавальнячых матэрыяльных умоў. У канцы 50-х гадоў абсалютная большасць чыноўнікаў ў Беларусі належала па-ранейшаму да мясцовых ураджэнцаў, пераважна каталіцкага веравызнання. Толькі вышэйшыя губернскія пасады ў асноўным займалі выхадцы з велікарускіх губерняў. Чыноўнікі-каталікі паводле разгледжаных намі фармулярных спіскаў служачых розных устаноў Мінскай губерні складалі 65,6% , Гродзенскай - 79,7%. Такая канфесійная структура складу дзяржаўных служачых была абумоўлена канфесійнай структурай той сацыяльнай групы, з якой пераважна набіралася ніжэйшае чыноўніцтва - мясцовай дробнай шляхты.

У П. 3.3. разглядаюцца змены ў чыноўніцкім складзе дзяржаўнага апарату ў беларускіх губернях пасля паўстання 1863 г. У гэты час царскі ўрад прымае рашучыя захады па замене мясцовых чыноўнікаў каталіцкага веравызнання выхадцамі з велікарускіх губерняў, дзеля чаго апошнім былі нададзены службовыя і іншыя ільготы. У першую чаргу гэта тычылася тых пасадаў, абавязкам якіх быў непасрэдны кантакт з насельніцтвам. У выніку ў 1868 г. сярод 3400 класных чыноўнікаў пяці беларускіх губерняў служачыя праваслаўнага веравызнання складалі ўжо 76,5%. Аналіз фармулярных спіскаў праваслаўных чыноўнікаў Гродзенскай губерні паказаў, што прыкладна каля палавіны з іх прыехала ў Беларусь з цэнтральных губерняў. Менавіта гэтыя чыноўнікі і сталі галоўнай апорай царскага самадзяржаўя ў правядзенні палітыкі поўнага зліцця беларускіх земляў з ўласна расійскімі ў нацыянальна-культурных адносінах, якая не пацярпела істотных зменаў да развалу імперыі ў 1917г.

## ВЫСНОВЫ

1. Мясцовы дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі будаваўся ў адпаведнасці з агульнаімперскім заканадаўствам паводле ўзору цэнтральных губерняў. У першай трэці XIX ст. існавалі адрозненні ў сістэме судовых устаноў і саслоўнага самакіравання, якія былі зліквідаваны царскім урадам пасля паўстання 1830-31 гг. Аднак у выніку ўрадавай палітыкі ўзніклі новыя асаблівасці ў структуры і функцыях дзяржапарату, звязаныя з узмацненнем бюракратычнага элементу і пашырэннем уладных паўнамоцтваў урадавых устаноў, найперш генерал-губернатараў, губернатараў і паліцыі, а таксама ўтварэннем часовых ваенна-паліцэйскіх упраўленняў. Адрозненні ад унутраных губерняў імперыі існавалі таксама і ў сістэме фінансава-гаспадарчых устаноў беларускіх губерняў. Яны былі абумоўлены асаблівасцямі сацыяльнай структуры насельніцтва і гаспадарчага жыцця.

2. Пасля паўстання 1863 г. у беларускіх губернях былі ўтвораны пасады ваенна-павятовых і станавых начальнікаў, жандарскія каманды, ваенна-следчыя камісіі. Усе названыя структуры надзяляліся павышанымі ўладнымі паўнамоцтвамі, у першую чаргу - паліцэйскімі. Надзвычайныя законы і пастановы пашыралі і адпаведныя паўнамоцтвы губернатараў і звычайных паліцэйскіх чыноўнікаў. Гэтыя крокі царскага ўрада былі скіраваны на забеспячэнне палітыкі нацыянальна-культурнай асіміляцыі беларускіх земляў. У структурнай арганізацыі дзяржаўнага апарату ў Беларусі ўзніклі адрозненні ад цэнтральных губерняў імперыі, звязаныя з адмовай урада праводзіць тут земскую і судовую рэформы.

3. У прызначэнні дзяржаўных служачых на судовыя і адміністрацыйныя пасады спалучаліся два падыходы - бюракратычны, калі чыноўнікі прызначаліся вышэйшым кіраўніцтвам, і выбарны, калі апошнія выбіраліся ад саслоўяў. Пасля паўстання 1831 г. урад пазбавіў дваранства Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў права выбіраць паліцэйскіх чыноўнікаў і абмежаваў колькасць выбарных імі судовых чыноўнікаў. Больш абмежаванымі ў параўнанні з велікарускімі губернямі былі таксама магчымасці гараджан і казённых сялян у Беларусі выбіраць сваіх прадстаўнікоў на пасады ў дзяржаўных установах. У 60-х гадах XIX ст. выбарныя пасады ў мясцовым дзяржаўным апараце беларускіх губерняў былі ўвогуле ліквідаваны.

4. Важную ролю ў механізме функцыянавання мясцовага кіравання ў разглядаемы хранапагічны перыяд адыгрывалі выбарныя саслоўныя ўстановы, у першую чаргу - дваранскія. Пасля паўстання 1831 г. царскі ўрад абмежаваў правы дваранскага самакіравання ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях, а таксама колькасць асобаў, якія маглі ўдзельнічаць ў выбарах. Гарадское самакіраванне было уніфікавана ў адпаведнасці з агульнаімперскім заканадаўствам. Прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва, якое складала большасць гараджан у Беларусі, атрымалі права ўдзелу ў яго рабоце, аднак, з пэўнымі абмежаваннямі. У 30-х гадах пачынаецца арганізацыя на беларускіх землях сялянскага самакіравання. Усе саслоўныя ўстановы функцыянавалі пад пільным наглядам з боку дзяржаўных бюракратычных структур, найперш губернатараў, якія мелі права не зацвярджаць выбраных асобаў на пасады з прычыны палітычнай "нядобранадзейнасці". Пасля паўстання 1863 г. дваранскае самакіраванне на беларускіх землях было фактычна ліквідавана. Урад таксама адмовіўся ад утварэння тут усесаслоўных земскіх установаў. Заснаваныя у 1861 г. органы сялянскага валаснога самакіравання былі пастаўлены ў поўную залежнасць ад дзяржаўнай адміністрацыі.

5. Чыноўніцкі корпус мясцовых дзяржаўных установаў у беларускіх губернях на працягу 30-50-х гг. фарміраваўся пераважна з мясцовых ураджэнцаў, у большасці сваёй - з дробнай шляхты каталіцкага веравызнання. Спробы царскага ўрада пасля паўстання 1830-31 гг. прыцягнуць на Беларусь чыноўнікаў з цэнтральных губерняў імперыі не далі значных вынікаў. Такія чыноўнікі займалі толькі кіруючыя губернскія пасады. Пасля паўстання 1863 г. урад прыклаў вялікія намаганні для замены асабовага складу дзяржаўнага апарату ў Беларусі. Большасць чыноўнікаў каталіцкага веравызнання была звольнена са службы. На ўсе пасады, абавязкам якіх з'яўлялася праца з насельніцтвам, прызначаліся амаль выключна выхадцы з унутраных губерняў імперыі, каторым выплочвалася дадатковае ўтрыманне і надаваліся ільготы ў набыцці зямельных участкаў. Менавіта гэтыя чыноўнікі сталі галоўнай апорай царскага ўрада ў правядзенні яго палітыкі на беларускіх землях.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ

1. Граф М.М.Мураўёў і канфесійная палітыка царызму на Беларусі.1827-1835гг.// Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі "Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII - пач.XX ст." - Гродна, 1992. - Кн.4. Ч.3. - С.614-621.

2. Мураўёў-Вешальнік і палітыка расійскага самаўладства на Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.//Гарадзенскія запісы - Гародня, 1993.- Вып.1. - С.80-84.

3. Расійскі чыноўнік на беларускай глебе// Беларуская мінуўшчына. - 1993. - № 3-4. - С.24-26.

4. Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30-50-я гады XIX ст.// Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. - 1996. - № 2. - С.67-70.

5. Асабовы склад дзяржаўнага апарату царызму ў Беларусі (30-60-я гады XIX ст.)//Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук.- 1996. - № 2.- С.70-76.

6. Уніяцкія святары Гарадзенскай губерні ў 30-х гг. XIX ст.//Наш Радавод. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гістарычная памяць народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII-XIX стст." - Гродна, 1996. - Кн.7. - С.388-390.

7. Шляхецкае самакіраванне ў Гродзенскай губерні ( пачатак XIX ст. - 60-ыя гады XIX ст.)//Bialoruskie Zeszyty Historyczne. - 1997. - № 1(7). - S.5-22.

# Р Э З Ю М Э

## ТОКЦЬ СЯРГЕЙ МІХАЙЛАВІЧ

## ДЗЯРЖАЎНЫ АПАРАТ ЦАРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ Ў 30-60-х гг. XIX ст.

Адміністрацыя, бюракратычны апарат, губерня, кадравая палітыка, мясцовае кіраванне, Расійская імперыя, саслоўнае самакіраванне, уніфікацыя, царызм, чыноўніцтва.

На аснове гістарычнага аналізу шырокага кола крыніц ( матэрыялы афіцыйнага справаводства, даведачна-статыстычныя матэрыялы, запіскі і ўспаміны сучаснікаў), многія з якіх упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак, у дысертацыі комплексна даследуецца арганізацыйная структура, механізм функцыянавання і чыноўніцкі корпус мясцовага дзяржаўнага апарату Расійскай імперыі ў Беларусі ў 30-60-х гадах XIX ст.

Аўтар прыходзіць да высновы, што ў сістэме мясцовага кіравання царызму на беларускіх землях існаваў шэраг адрозненняў ад цэнтральных губерняў імперыі. Гэтыя адрозненні былі абумоўлены гістарычнай спадчынай і палітычнай сітуацыяй ( паўстанні 1831 і 1863 гадоў). Палітыка ўрада ў Беларусі накіроўвалася на ліквідацыю названых асаблівасцей. Аднак на практыцы яна прывяла да таго, што мясцовая адміністрацыя атрымала тут значна больш шырокія паўнамоцтвы, чым у цэнтральных губернях імперыі.

Упершыню ў беларускай навуковай літаратуры атрыманы дадзеныя па складу мясцовага чыноўніцкага корпусу адносна веравызнання, саслоўнага паходжання, маёмаснага становішча і адукацыйнага ўзроўню. Устаноўлена, што да 1863 г. абсалютная большасць чыноўнікаў у беларускіх губернях належала да мясцовых ураджэнцаў, выхадцаў з дробнай шляхты, пераважна каталіцкага веравызнання. Пасля паўстання 1863 г. урад пачаў прызначаць на ўсе пасады, абавязкам якім была праца з насельніцтвам, выхадцаў з цэнтральных губерняў імперыі.

Вынікі дадзенага дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы абагульняючых прац і пры вывучэнні асобных праблем гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі.

# РЕЗЮМЕ

ТОКТЬ СЕРГЕЙ МИХАЙЛОВИЧ

## ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АПАРАТ ЦАРИЗМА В БЕЛАРУСИ В 30-60-х годах XIX в.

Администрация, бюрократический апарат, губерния, кадровая политика, местное управление, Российская империя, сословное самоуправление, унификация, царизм, чиновничество.

На основе исторического анализа широкого круга источников (материалы официального делопроизводства, справочно-статистические материалы, записки и воспоминания современников), многие из которых впервые введены в научный оборот, в диссертации комплексно исследуется организационная структура, механизм функционирования и чиновнический корпус местного государственного апарата Российской империи в Беларуси в 30-60-х годах XIX ст.

Автор приходит к заключению, что в системе местного управления царизма на беларуских землях существовал целый ряд отличий от центральных губерний империи. Эти отличия были обусловлены историческим наследием и политической ситуацией (восстания 1831 и 1863 гг.). Политика правительства в Беларуси направлялась на ликвидацию означенных особенностей. Однако на практике она привела к тому, что местная администрация получила здесь значительно более обширные полномочия, чем в централвных губерниях империи.

Впервые в беларуской историографии получены данные по составу местного чиновнического корпуса относительно вероисповедания, сословного происхождения, имущественного состояния и образовательного уровня. Установлено, что до 1863 г. абсолютное большинство чиновников в беларуских губерниях принадлежало к числу местных уроженцев, преимущественно выходцев из мелкого дворянства католического вероисповедания. После восстания 1863 г. правительство начало назначать на все наиболее важные должности выходцев из центральных губерний империи.

Итоги данного диссертационного исследования могут быть использованы при разработке обобщающих работ и при изучении отдельных проблем истории Беларуси в составе Российской империи.

## SUMMARY

TOKC SIARHEJ MIKHAILAVIC

### STATE MACHINERI OF TSARISM IN THE 1830 - 1860 s.

Administration, bureacracy, province, staff policy, lokal government, Russian empire, estate self-government, unification, employees.

Organizational structure, governance and personnel of local state machinery of the Russian empire in Belarus in the 1830 - 1860 s. are investigated in the dissertation on the basis of a wide range of sources (administrative and statistikal materials, diaries and memoris of contemporaries), many of which are first used.

The author comes to the conlusion that the system of local government on the belarusan lands possessed a number of differences as compared with central provinces of the empire. These differences were caused by the historical past and the political situation (uprisings of 1830 and 1863). The policy of tsarism in Belarus aimed at elimination of the above-mentioned differences. Howeuer, in reality it usually led to the growth of power, prerogatiwes of local administration which were much wider than in central provinces of the empire.

The data concerning the personnel according to confession, estate, property and education are first obtained in the belarusan historical literature. It is proved that before 1863 the absolute majority of personnel in the belarusan lands belanged to local inhabitants who were of lesser nobility and mainly of Catholic faith. After the uprising of 1863 the tsarist government began to use representatives of central provinces of the empire as office - holders whose main obligation was working with local population.

The results of the dissertation can be used for elaborating general historical works and studying certain problems of history of Belarus in the Russian empire.

подписано в печать 14.05.97 г. Бумага кн.-журн.
Формат 60х84/16. Печать офсетная. Усл. печ. л. 1,16 .
Уч.-изд. л.1,0. Тираж 70 экз. Заказ 71

Гродненский государственный университет
имени Янки Купалы

---

Отпечатано на технике издательского отдела Гродненского
государственного университета им. Я. Купалы
230023, г. Гродно, ул. Ожешко, 22

303169

Ab 71.052